Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

# Праектаванне і распрацоўка відаў кіруемай самастойнай працы студэнтаў па курсе “Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя”

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

2018 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Уводзіны..........................................................................................3

**Глава 1 Псіхолага-педагагічныя асновы самастойнай работы студэнтаў**

§ 1.1 Самастойная работа студэнтаў як псіхолага-педагагічная праблема..........................................................................................5

§ 1.2 Віды і ўзроўні самастойнай работы..........................................................................................8

§ 1.3 Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў у вучэбным працэсе..........................................................................................10

**Глава 2 Распрацоўка відаў кіруемай самастойнай працы студэнтаў па курсе "Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя."**

§ 2.1. Сінтаксічныя адзінкі мовы: словазлучэнне, сказ, іх параўнальная характарыстыка……………………………………………………………..12

§ 2.2. Спецыфіка беларускамоўных словазлучэнняў у параўнанні з рускамоўнымі……………………………………………………………13

§ 2.3. Сінтаксічна непадзельныя сказы. Няпоўныя сказы……………………15

§ 2.4. Парадак слоў у сказе. Актуальнае чляненне сказа……………………...16

§ 2.5. Чужая мова і спосабы яе перадачы: простая, ускосная і няўласна-простая мова……………………………………………………………18

**Заключэнне**..........................................................................................20

**Спіс літаратуры**..........................................................................................21

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Уводзіны

Мэтай рэфармавання сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь з’яўляецца фарміраванне спецыяліста новага тыпу, здольнага да максімальнай рэалізацыі інтэлектуальнага і крэатыўнага патэнцыялу, з высокім узроўнем прафесійнай падрыхтоўкі. Спецыяліста, які спалучае прафесійную дзейнасць з навыкамі навукова-даследчай працы і валодае свядомай патрэбнасцю ў непарыўным павышэнні кваліфікацыі, у развіцці і самаразвіцці.

Сучасная сістэма адукацыі ў вну базуецца на прынцыпах асобасна-развіццёвага навучання, якое спрыяе прафесійнаму самавызначэнню асобы ва ўмовах суб’ект-суб’ектных зносін у вучэбна-выхаваўчым працэсе і адносін партнёрства ў практычнай дзейнасці. Пры гэтым можна назваць два крытэрыі, якія вызначаюць мэтазгоднасць і эфектыўнасць падрыхтоўкі спецыяліста ў канкрэтнай прафесійнай вобласці: сацыяльная карыснасць і колькасць затрат на яго падрыхтоўку. Як вядома, найбольшай колькасці затрат патрабуе фундаментальная (тэарэтычная) падрыхтоўка спецыяліста, найбольш хуткай аддачы можна чакаць ад практычнай падрыхтоўкі.

Галоўным кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі, які звязвае тэорыю і практыку, з’яўляюцца прыкладныя аспекты адукацыі. У першую чаргу – тэхналогія навучання суб’ектаў адукацыйнага працэсу. З пункту погляду навучання і прафесійнага станаўлення асобы вырашаецца толькі адна задача – сфарміраваць здольнасць прыняцця самастойных рашэнняў. Іншымі словамі, сёння неабходна забяспечыць пераход ад навучання да вучэння, а потым ад самастойнай вучэбнай дзейнасці да перманентнай патрэбнасці ў самаадукацыі і самарэалізацыі. У гэтым кірунку ў беларускай вышэйшай школе актыўна вывучаецца праблема арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў (КСРС). Гэтым абумоўліваецца выбар тэмы кваліфікацыйнай працы.

**Мэта працы** – ахарактарызаваць псіхолага-педагагічныя асновы самастойнай работы студэнтаў і паказаць спосабы яе арганізацыі пры выкладанні тэмы “Сучаная беларуская мова: Сітаксіс. Пунктуацыя.”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для дасягнення пастаўленай мэты ў рабоце вырашаліся наступныя **задачы:**

1. Ахарактарызаваць самастойную работу студэнтаў як псіхолага-педагагічную праблему.
2. Апісаць віды і ўзроўні самастойнай работы.
3. Вызначыць патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў.
4. Распрацаваць заданні для кіруемай самастойнай працы студэнтаў па курсе "Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя".

Праца складаецца з уводзін, дзвюх глаў, заключэння, спіса выкарыстанай літаратуры (10 крыніц). У першай главе самастойная работа студэнтаў апісваецца як псіхолага-педагагічная праблема, характарызуюцца яе віды і ўзроўні, акрэсліваюцца патрабаванні да арганізацыі самастойнай працы студэнтаў. У другой главе падаюцца разнастайныя заданні для самастойнай кіруемай працы студэнтаў па курсе "Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя", прапануецца вучэбная літаратура, удзяляецца ўвага пытанням для самакантролю, адзначаюцца формы кантролю выкладчыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Глава 1 Псіхолага-педагагічныя асновы самастойнай работы студэнтаў

## *§ 1.1 Самастойная работа студэнтаў як псіхолага-педагагічная праблема*

Фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнай работы з'яўляецца галоўнай задачай спачатку вучэбнай, а затым і прфесійнай дзейнасці. Між тым, у сучаснай псіхолага-педагагічнай літаратуры адсутнічае агульнапрызнанае азначэнне паняцця "самастойная работа". Згодна класіфікацыі І. А. Новік, самастойная работа можа разглядацца:

1) як метад навучання (А. Г. Кавалёў Н. В. Кузьміна, А. В. Усава);
2) як форма арганізацыі дзейнасці навучэнца (Б. П. Есіпаў);
3) як від пазнавальнай дзейнасці (М. П. Кашан, Н. П. Качаткова);
4) як сродак уцягвання навучэнцаў у самастойную пазнаваўчую і практычную дзейнасць (І. Я. Лернер, М. Н. Скаткін).

На думку В. Л. Жук, самастойная работа студэнтаў – гэта разнастайныя віды індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці навучэнцаў на аўдыторных і пазааўдыторных занятках або ў дамашніх умовах (бібліятэцы) па выкананні розных заданняў пад метадычным кіраўніцтвам выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу[4, с. 10]. Самастойная работа разглядаецца як спецыфічная форма вучэбнай дзейнасці студэнта і характарызуецца шэрагам псіхолага педагагічных асаблівасцяў.

Па-першае, яна з'яўляецца следствам і працягам мэтазгодна арганізаванай выкладчыкам пазнаваўчай і вучэбна-даследчай дзейнасці ў вучэбны час, што стымулюе студэнтаў да далейшай самастойнай пошукавай і даследчай работы ў вольны час. Пры гэтым арганізаваная і кіруемая выкладчыкам вучэбна-пазнаваўчая дзейнасць студэнта на аўдыторных занятках выступае своеасаблівым алгарытмам або праграмай самастойнай работы па авалоданню вучэбным прадметам або правядзенні даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па-другое, самастойная работа студэнта павінна быць усвядомлена ім як выбіраемая і ўнутрана матываваная дзейнасць па засваенні вучэбнага матэрыялу. Пры гэтым самастойная работа сткдэнтаў прадугледжвае выкананне навучэнцамі наступных дзеянняў: усведамленне мэт сваёй дзейнасці, прыняцце або пастаноўка вучэбнай задачы, самаарганізацыя ў размеркаванні вучэбных дзеянняў у часе, карэкціраванне ўласнай работы на аснове самакантролю і самаацэнкі.

Па-трэцяе, самастойная работа навучэнцаў з’яўляецца высока арганізаванай формай вучэбнай дзейнасці, а характар яе выканання і вынікі абумоўліваюцца асобаснымі асаблівасцямі студэнта як суб’екта самастойнай работы. Да іх належаць: самарэгуляцыя, якая прадугледжвае высокі ўзровень самасвядомасці студэнта; адэкватная самаацэнка; рэфлексіўнае мысленне; самастойнасць; арганізаванасць; мэтанакіраванасць асобы; сфарміраванасць валявых якасцяў; прадметная самарэгуляцыя. Важным паказчыкам сфарміраванасці прадметнай самарэгуляцыі студэнта выступае наяўнасць праектыровачных уменняў, звязаных з вызначэннем мэты і канчатковых вынікаў дзейнасці, адборам зместу, спосабаў, сродкаў дзейнасці, рэфлексіяй і карэкціроўкай як вынікаў, так і самога працэсу дзейнасці.

Такім чынам, самастойная работа студэнтаў можа быць вызначана як мэтанакіраваная, унутрана матываваная, структурыраваная самім суб’ектам (студэнтам) і карэкціруемая ім дзейнасць (як па працэсу, так і па выніку). Яе выкананне прадугледжвае дастатковы ўзровень самасвядомасці, рэфлексіўнасці, самадысцыпліны, асабістай адказнасці, крэатыўнасці навучэнца, што дазваляе разглядаць самастойную дзейнасць студэнтаў як працэс самаўдасканалення і самапазнання.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў накіравана на рашэнне наступных задач [4, с. 12]:

а) замацаванне, абагульненне і паўтарэнне пройдзенага вучэбнага матэрыялу; прымяненне атрыманых ведаў у стандартных сітуацыях і пры рашэнні задач высокага ўзроўню складанасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

б) удасканаленне прадметных уменняў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах; фарміраванне міжпрадметных, агульнавучэбных, даследчых уменняў;

в) актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці навучэнцаў, яе максімальная індыдвідуалізацыя з улікам псіхафізічных асаблівасцяў, акадэмічнай паспяховасці студэнтаў;

г) фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі на працягу ўсяго жыцця.

Асноўнымі ўмовамі, якія забяспечваюць паспяховае выкананне студэнтамі самастойнай работы, з'яўляюцца:

- матываванасць вучэбнага задання;
- дакладная пастаноўка пазнаваўчых і даследчых задач пры прапанове студэнту выбару спосабаў рашэння;
- прапанаваныя выкладчыкам або самастойна распрацаваныя студэнтам праграма або алгарытм выканання работы;
- вызначэнне выкладчыкам формы справаздачы, аб'ёма работы, тэрмінаў яе здачы і крытэрыяў выніковасці;
- вызначэнне відаў педагагічнай падтрымкі і кансультацыйнай дапамогі;
- чаргаванне розных відаў і формаў кантролю за выкананнем самастойнай работы;
- забеспячэнне студэнтам доступу да інфармацыйна-тэхнічных рэсурсаў, якія дазваляюць больш якасна вырашаць задачы.

Самастойная работа студэнтаў ажыццяўляецца ў дзвюх асноўных формах:

- уласна самастойная работа студэнтаў (СРС), якая арганізуецца самім студэнтам у рацыянальны з яго пункту погляду час, як правіла, па-за аўдыторыяй, матывіруецца ўласнымі пазнаваўчымі патрэбнасцямі і кантралюецца ім самім;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- кіруемая самастойная праца студэнтаў (КСРС) як апасродкаванае кіраўніцтвам з боку выкладчыка самастойнае выкананне студэнтам пастаўленага выкладчыкам вучэбнага (даследчага) задання.

У практыцы навучання ў вышэйшай школе выдзяляюцца два асноўныя віды СРС:

- індывідуальная самастойная работа (работа з вучэбнай і навуковай літаратурай, падрыхтоўка да лекцый, семінарскіх і лабараторных заняткаў, залікаў, экзаменаў, выкананне і абарона курсавых і дыпломных работ, навукова-даследчых праектаў, напісанне рэфератаў, распрацоўка індывідуальных заданняў і інш.);

- групавая самастойная работа (распрацоўка і абарона калектыўных навукова-даследчых праектаў, творчых заданняў і інш.), якая спрыяе ўзмацненню матывацыі і актыўнасці вучэбна-даследчай дзейнасці студэнтаў, павышэнню яе эфектыўнасці за кошт палілогавых формаў абмеркавання праблем узаемнага кантролю і калектыўнай рэфлексіі.

## *§ 1.2 Віды і ўзроўні самастойнай работы*

І. А. Новік, зыходзячы з наяўнасці двух відаў разумовай самастойнасці (адлюстравальна-узнаўляльнай і адлюстравальна-творчай), выдзяляе наступныя віды самастойных заданняў:

Работа па ўзоры. У выніку выканання заданняў па ўзоры студэнты асвойваюць спосабы рашэння задач па ўказанню выкладчыка з выкарыстаннем пэўнага алгарытма. Так фарміруюцца навыкі і рашаюцца задачы, заснаваныя на канвергентным мысленні.

Рэканструктыўна-варыятыўныя заданні. Выконваючы дадзены від самастойнай работы, студэнты набываюць вопыт пераносу ведаў і ўменняў, іх абагульнення і трансфармацыі.

Самастойную работу студэнтаў можна класіфікаваць таксама і па іншых параметрах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Часткова-пазнаваўчыя заданні. У працэсе работы над часткова-пошукавымі заданнямі студэнты вучацца самастойна вызначаць аб'ём неабходных ведаў і знаходзіць адэквтныя спосабы іх набыцця.

Даследчыя заданні. Па меры навучання ў вну адбываецца паэтапнае ўскладненне заданняў: ад работы па ўзору да самастойных даследчых работ пры адначасовым зніжэнні апекі з боку выкладчыка. Самастойна – гэта не толькі "выконваю сам", але і "выконваю для сябе". Пры самастойнай рабоце даследчага характару студэнты творча падыходзяць да яе выканання.

Самастойную работу студэнтаў можна класіфікаваць таксама па другіх параметрах. У залежнасці ад дыдактычных мэт і задач, якія вырашаюцца ў працэсе самастойнай работы, можна выдзеліць наступныя віды самастойнай работы [4, с. 19]:

1) самастойная работа па ўдакладненню і дапаўненню звестак і ведаў, атрыманых на вучэбных занятках (праца з тэкстам, правядзенне эксперыменту і інш.);
2) самастойная работа па фарміраванні практычных уменняў і навыкаў на аснове выканання заданняў (або рашэння задач);
3) самастойная работа па набыцці студэнтамі новых ведаў;
4) самастойная работа па развіцці ў студэнтаў агульнавучэбных уменняў, разумовых працэсаў (аналізу, сістэматызацыі і абагульнення, класіфікацыі і інш.);
5) самастойная работа па задавальненні адукацыйных запатрабаванняў і інтарэсаў студэнтаў (рэферат, навуковая работа і інш.).

Крыніцамі інфармацыі пры выкананні студэнтамі ўказаных відаў самастойнай работы могуць выступаць:

- друкаваныя матэрыялы;
- матэрыялы на электронных носьбітах;
- візуальна-графічныя матэрыялы, гукавое суправаджэнне пры дапамозе радыё- і тэлеапаратуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- вынікі эксперыментаў у працэсе вучэбна-пазнаваўчай і навукова-даследчай дзейнасці і інш.

### *§ 1.3 Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў у вучэбным працэсе*

Аналіз сучаснай псіхолага-педагагічнай літаратуры [1, 2, 7, 8] дазваляе сфармуляваць наступныя асноўныя этапы арганізацыі ў навучальным працэсе самастойнай работы студэнтаў:

1. Падрыхтоўчы, звязаны з вызначэннем на вучэбных занятках у студэнтаў пачатковага ўзроўню ведаў і ўменняў самастойнай работы, азнаямленнем іх з сістэмай і метадамі самастойнай работы па прадмету. Рэалізацыя дадзенага этапа накіравана на фарміраванне ў студэнтаў матывацыі да самастойнай работы, свядомасці пры яе выкананні.

2. Трэніровачны, у працэсе якога ставіцца задача на практычных занятках (у межах КСР) навучыць кожнага студэнта сістэме самастойнай работы над літаратурай па прадмету, сфарміраваць агульнавучэбныя уменні, а таксама практычныя ўменні па прымяненні ведаў па ўзору.

3. Фарміруючы, накіраваны ў ходзе вучэбных заняткаў, кансультацый на развіццё ў студэнтаў уменняў і навыкаў прымянення даследчага падыходу да вывучэння праблем вучэбнай дысцыпліны або профільнай навукі, сумежных абласцей ведаў і прымянення навуковых дасягненняў у будучай прафесійнай дзейнасці.

4. Творчы, дзе студэнтамі ў ходзе індывідуальных кансультацый засвойваецца сістэма арганізацыі самастойнай вучэбна-даследчай работы, ажыццяўляецца падрыхтоўка да ўдзелу ў спецсемінарах, алімпіядах і конкурсах, навукова-практычных канферэнцыях, да напісання навуковых, курсавых і дыпломных прац.

5. Заключны, накіраваны на падвядзенне вынікаў самастойнай вучэбнай і вучэбна-даследчай работы кожнага студэнта па прадмеце за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

семестр (або за ўвесь вучэбны год). Пасля праходжання студэнтамі прамежкавага і выніковага тэсціравання па прадмеце або выканання кантрольных работ, здачы заліку (экзамену) на аснове выніковай рэйтынгавай ацэнкі выкладчыкам даецца разгорнутая характарыстыка іх самастойнай дзейнасці, ацэнка дасягнутых вучэбных і навуковых вынікаў. З улікам вынікаў самастойнай работы студэнтам можа быць прапанавана даследаваць пэўную праблему ў межах курсавога або дыпломнага праекта.

Эфектыўнасць арганізацыі самастойнай работы студэнтаў дасягаецца за кошт:

- распрацоўкі выкладчыкам сістэмы заданняў трэніровачнага і ўскладненага тыпаў, прызначаных для індывідуальнай і групавой работы, разлічаных як на кароткачасовы, так і на працяглы перыяды іх выканання;
- узгодненасці і пераемнасці паміж зместам, метадамі рашэння і ацэньвання вынікаў выканання заданняў, прызначаных для самастойнай распрацоўкі на лекцыйных, практычных занятках, у дамашніх умовах, уперыяд вытворчай практыкі і ў ходзе навукова-даследчай працы студэнтаў, уключаючы працу над курсавымі і дыпломнымі праектамі;
- уліку індывідуальных асаблівасцяў і магчымасцяў студэнтаў з мэтай развіцця ў іх навуковых інтарэсаў, прафесійных здольнасцяў у працэсе самастойнай работы; а таксама распрацоўкай у адпаведнасці з патрэбнасцямі прафесійнага станаўлення заданняў для самастойнага выканання;
- канструяванне зместу вучэбнага матэрыялу і заданняў для самастойнай работы з выкарыстаннем камп'ютэрных сродкаў, што забяспечвае аўтаматызаваны сістэматычны кантроль самастойнай работы студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Глава 2. Распрацоўка відаў кіруемай самастойнай працы студэнтаў па курсе “Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя.”

## *§ 2.1 Сінтаксічныя адзінкі мовы: словазлучэнне, сказ, іх параўнальная характарыстыка*

**Літаратура:**

1. Беларуская мова / Пад агульн. рэд. Л.М.Грыгор'евай.— Мн., I994.
2. Сямешка Л.I. Шкраба I.Р., Бадзевіч 3.1. Курс 6едарускай мовы: Падручнік. — Мн.: Універсітэцкае, 1996. —С.478-482,487-488
3. Яўневіч М.С. Сцяцко П.У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. — Мн.: Выш. шк. 1987. — с.5-13.

**Пытанні для самакантролю:**

-Што такое словазлучэнне? Што агульнае паміж словам і словазлучэннем і што адрознівае іх?
- Якія спалучэнні слоў не з'яуляюцца словазлучэннямі?
- Што такое сказ?
- Што агульнага і чым адрозніваецца словазлучэнне ад сказа?
- Ці можа адно і тое ж спалучэнне слоў быць і словазлучэннем і сказам?

**Заданне 1** Выпішыце словазлучэнні. Назавіце галоўныя і залежныя словы.

Дзень быў ясны. Горача прыпякала сонца, але ў лесе адчувалася прахлада. Паабапал дарогі высокай пышна - зялёнай сцяной стаяў лес, шчодра заліты сонечным святлом. Раскідвалі густалістае веццe магутныя ліпы, клёны, вязы, цягнуліся ў неба гонкія сосны, цямнелі піраміды стогадовых ялін. Усё гэта стварала агульныя шаты, у якіх дрыжалі, пераліваліся залатыя блікі сонца. Знізу як бы падпіраў дрэвы падлесак, зелянелі ягаднікі, папараць (Тарас Хадкевіч).

**Заданне 2.** Спішыце тэкст, якія з падкрэсленных спалучэнняў слоў не з'яўляюцда словазлучэннямі, абгрунтуйце свой выбар.

**Францыск Скарына** жыў у цікавы час, які мы **сёння называем** эпохай еўрапейскага Адраджэння. Тады адраджаліся **краіны і народы**, людзі сталі **больш глыбока** спасцігаць сваё мінулае, вьвучаць і **ўзнаўляць кулыурна-гістарычную** спадчыну. Тады **адбывалася пераацэнка** многіх ранейшых

каштоўнасцей, фарміраваўся новы чалавек са сваімі **поглядамі і захапленнямі**, больш дзейны і **духоўна свабодны**, поўны ўласнай годнасці і веры не толькі ў боскую, але і ў сваю ўласную ўсемагутнасць. (Вячаслаў Чамярыцкі)

**Зданне 3.** Падзяліце тэкст на асобныя сказы, ставячы ў канцы іх патрэбныя знакі прыпынку.

Вечарэла ў акне відаць былі асветленыя скупым сонцам вяршыні хвой і елак за сцяной у вуллі сціхаў пчаліны гуд з ціхім посвістам праляцелі над хатай дзікія качкі недзе ў лесе азваўся крумкач, відаць, дабраўся да гнязда пасля дзённых вандраванняў першы вячэрні жук выткнуўся аб шыбіну акна змоўк на якую хвіліну і зноў загуў ля мададой бярозкі над акном над балоцінкай сумна забляяў баранчык вячэрні змрок неўзаметку прабіраўся ў куткі хаты паступова цямніў сцены столь шырокую печ ля парога адазваўся ў запечцы цвыркун — веснік блізкай ночы. (М. Лынькоў)

**Форма кантролю**: экспрэс - кантрольная работа.

## *§ 2.2 Спецыфіка беларускамоўных словазлучэнняў у параўнанні з рускамоўнымі*

**Літаратура:**

1. Беларуская мова / Пад агульн. рэд. Л.М.Грыгор'евай.— Мн., 1994.
2. Беларуская мова: Падручнік для навучэнцаў педвучылішчаў/ Пад агульнай рэд. Л.М.Грыгор'евай.— Ч.2.—Мн., 1998.—С. 17-19
3. Беларуская мова: Вучэбны дапаможнік / Пад рэд. М.С.Яўневіча. - Мн., 1991.—281-284.
3. Практыкум па беларускай мове / Пад агул. рэд. Г.М.Малажай.— Мн: "Выш.шк.", 1993.— С.225

**Пытанні для самакантролю:**

- У чым заключаецца спецыфіка беларускага кіравання ў словазлучэннях з дзеясловамі *дзякаваць, падзякавацъ, аддзячыць, выбачаць, прабачыцъ, даравацъ?*
- Назоўнікамі ў форме якога склону кіруюць дзеясловы руху *(ісці, бегчы,*

*ехаць, плыць, ляцець)* і волевыяўлення *(паслаць, выправіць, адправіць* ) у беларускай мове?

- Вызначце асаблівасці кіравання ў словазлучэннях з дзеясловамі думкі , пачуцця, маўлення *(гаварыць, думаць, непакоіць, хвалявацца)* у беларускамоўных словазлучэннях?
- Ахарактарызуйце асаблівасці беларускага кіравання і дапасавання ў словазлучэннях.

**Заданне 1.** Запішыце сказы, раскрываючы дужкі, падкрэсліце дзеяслоўныя словазлучэнні, параўнайце з адпаведнымі словазлучэннямі ў рускай мове (пераклад дайце ў дужках).

1. Дзякуй (вы), шляхі-дарогі, што з паходаў грозных, ратных нас прыводзілі дадому. 2. Бралася (мароз), высвечвалі зоры. 3. Ты прабач (я) за ўсё, я ніколі не забылася (ты). 4. Аднойчы Андрэй з Аленай павезлі (млын) малоць жыта. 5. Рыгорка ўвесь пайшоў (бацька), і крышачкі падабраў. 6. Трэба сані рыхтаваць, ехаць у лес (дровы) і ў балота (сена). 7. Дарога (слава) заўсёды бывае цяжкай. 8. Маці зусім забылася (сон і адпачынак), адна гадуючы дзяцей. 9. Нават у малодшых класах Дзімка рашаў задачкі хутчэй (усе).

**Задание 2.** Перакладзіце на беларускую мову і запішыце наступныя словазлучэнні.

В пяти километрах, писать по адресу, послать за яблоками, жениться на ней, слышал своими ушами, идти за отцом, смотреть за детьми, говорить по телефону, определить по вкусу, мал по размеру, не сделать из-за лени, видеть своими глазами, читать про себя, благодарить товарища, дом в пять этажей, смеяться над ним, жить с детьми, заведующая детским садом, идти за малиной, выше дерева, больше года, два раза в день, забыть про уроки.

**Заданне 3.** Знайдзіце памылкі ў будове словазлучэнняў і, выправіўшы, запішыце сказы.

1. Падбіты самалёт рухнуў у васьмі кіламетрах ад станцыі. 2. Так смяяцца над сваімі недахопамі і недахопамі сяброў можа толькі добры, адкрыты чалавек. 3. Мой сябар разумнейшы за нас. 4. Дзякуем вас за шчырыя словы. 5. У час допыту фашысты здзекваліся над ею, але адважная партызанка нічога не выдала. 6. І я дзякую лёс, што ён і мне і маёй сястры падарыў цудоўных настаўнікаў. 7. Хочацца сказаць і аб вашай дабраце, спагадзе. 8. Па службовай лесвіцы ён падняўся вышэй нас. 9. Адразу паслалі тэлеграму па гэтым адрасе.10. Пасля таго, як Васіль ажаніўся на Валі, ён вымушаны быў жыць з

бацькамі і са старэйшым братам. 11. Над сабой пажартаваў з'едліва, нават бязлітасна.

**Заданне 4.** Выпішыце нарматыўныя словазлучэнні.

Сустракацца па суботам — сустракацца па суботах;
растуць тры высокія дубы —растуць тры высокіх дуба;
Андрэй смяшнейшы ўсіх у класе — Андрэй смяшнейшы за ўсіх у класе;
дубу не менш за сто год — дубу не менш за сто годоў;
дзякуем вас за ўдзел у перадачы — дзякуем вам за ўдзел у перадачы;
сына паслалі за бацькам — сына паслалі па бацьку;
смяяцца праз слёзы — смяяцца скрозь слёзы;
звяртацца за дапамогай — звяртацца па дапамогу;
дакрануцца к руцэ — дакрануцца да рукі
сумаваць аб былым — сумаваць па былым;
ведаць па газетах — ведаць па газетам;
дараваць настаўніка — дараваць настаўніку;
гуляць па праспекту — гуляць па праспекце;
заехаць к родным — заехаць да родных:
прабачыць сяброўку — прабачыць сяброўцы.

**Форма кантролю:** экспрэс-кантрольная работа

## *§ 2.3 Сінтаксічна непадзельныя сказы. Няпоўныя сказы*

**Літаратура:**

1. Беларуская мова / Пад агульн. рэд. Л.М.Грыгор'евай.— Мн., 1994.
2. Сямешка Л.І. Шкраба І.Р., Бадзевіч 3.1. Курс беларускай мовы: Падручнік. —Мн.: Універсітэцкае, 1996. — С.574-575.
3. Яўневіч М.С., Сцяцко П.У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. — Мн.: Выш. шк., 1987. —С.150-151, 153-156.

**Пытанні для самакантролю:**

- Якія сказы называюцца няпоўнымі?
- Чым бывае абумоўлена непаўната сказа?
- У якіх выпадках ставіцца працяжнік ў няпоўных сказах?
- На якія тыпы падзяляюцца няпоўныя сказы?
- Якія сказы называюцца эліптычнымі?
- Якія сказы называюцца сінтаксічна непадзельнымі?
- Ці адрозніваюцца сінтаксічна непадзельныя сказы па мэце выказвання?

**Задание 1.** Спішыце сказы і вызначце, якія з іх з'яўляюцца поўнымі, а якія — няпоўнымі? Чым абумоўлена непаўната сказа?

1. У лесе цішыня (К-с) 2. Над пасёлкам Янтарным занялася зара (Пр.) 3. Вунь ваша рэчка! Вунь школа ля гаю! (Бр.) 4. Вільготны вецер балюча біў у твар рэдкімі шрацінамі граду (Шам.) 5. На вуліцы — грузавая машына (Ракіт) 6. на небе свяціліся зоркі (К-с) 7. Надыходзіла раніца (Лыньк.) 8. Парк цяністы ля Крамля (Аўр.) 9. Над ракой нахіліліся старыя вольхі (Пт.) 10. Доўга цягнецца летні дзень (Шам.) 11. Над галавой — сіняе неба (Бяд.) 12. Антось заложна і цярпліва ў зямлю ўкладваў свае сілы (К-с)

**Задание 2.** Выканайце практыкаванні № 291 і 293 з падручніка "Беларуская мова" пад рэд. Л.М.Грыгор'евай.

**Задание 3.** Спішыце, вызначце тып і значэнне сінтаксічна непадзельных сказаў.

I .Што ж! Яму за адкрыццё падзяка (А.Зв.) 2. Ну? Хіба вы нічога не ведаеце? (Зар.) 3. Добрай раніцы, край наш любімы! (Астр.) 4. "Як вам, калега, спадабаліся паненкі?" — "Ну што ж! Дзяўчаты як дзяўчаты" (К-с). 5. "Бывайце, дарагія сябры! (Луж.) 6. Не! Смяюцца рана над табой завірухі ўзрадаванай енкі! (А.Зв.) 7. "Жэнька!" — "Ну!" — "Карову не карміла?" — "Не" (Б.) 8. Дабрыдзень, роднае сяло, дзень добры, хлопцы-камсамольцы! (Хв.) 9."Як жывеш, Алесь?" — "Нічога" (К.Ч.) 10. Лягла раллі за баразной луста ... У добры час! (Астр.)11."Чаго ты сядзіш тут?" — "Так сабе".— "Хадзі на вуліцу" — "Не хачу"— "Чаму?" — "Так" (К.Ч.)

**Форма кантролю:** праверка практычных заданняў

## *§ 2.4 Парадак слоў у сказе. Актуальнае чляненне сказа*

### Літаратура:

1. Беларуская мова: Сінтаксіс, Пунктуацыя Пад агульн. рэд. Я.М. Адамовіча.— Мн., 1989.

2. Беларуская мова: У 2 ч.:Ч.2: Падручнік для навучэнцаў педвучылішчаў і каледжаў/ пад агул.рэд.Л.М.Грыгор'евай. — Мн.: Выш.шк.,— С. 125-129.

3.Сямешка Л.І. Шкраба І.Р,, Бадзевіч З.І. Курс беларускай мовы: Падручнік. — Мн.: Універсітэцкае, 1996. — с.578-582

4. Яўневіч М.С., Сцяцко П.У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. — Мн.: Выш. шк., 1987. —С 160-163.

**Пытанні для самакантролю:**

- Што такое парадок слоў у сказе? Якое значэнне (функцыі) ён мае? Якія задачы вырашае ў беларускім сінтаксісе парадакк слоў?
- Які парадак слоў называюць прамым , а які адваротным?
- Чаму ў беларускай мове, дзе сувязь слоў у сказе ажыццяўляецца пры дапамозе канчаткаў, існуе патрэба пэўнага парадку слоў?
- Што такое актуальнае чляненне сказа?
- Як звязана размеркаванне ў сказе тэмы і рэмы з парадкам слоў і інтанацыяй?

**Заданне 1.** Вызначце, які парадак слоў у наступным тэксце (прамы, інверсійны) і якія яго функцыі (сінтаксічная, стылістычная).

Густы і мокры вецер гоніць сырыя і цяжкія хмары; яны грузна плывуць, лезучы адна на другую, закрываюць сабою неба і сонца і робяць асенні дзень шэрым і хмурным.

Часам спускаюцца яны нізка і сеюць на мокрую зямлю дробны дождж-імглу, а часам ўзнімаюцца вышэй і, не вытрымаўшы сілы ветру, разрываюцца і ачышчаюць бледную сінь неба. Тады пакідае ісці дождж, і пачынае выглядаць сонца.

Ад яго свету белая пена быстрай і шумлівай ад ветру ракі аддае жаўтавата - блішчастым колерам.

Рака выйшла з сваіх берагоў..

Густая і каламутная ад асенніх дажджоў вада ў ёй паднялася і заліла абодва берагі.

З быстрага размаху свайго кідае яна на іх сваёю пенай, б'ецца аб купчастыя вяршаліны затопленых ёю кустоў алешніку і крушыны і весела плюхае, бурліць і шуміць. (Кузьма Чорны)

**Заданне 2.** Спішыце, вызначце ў сказах выпадкі інверсіі галоўных і даданых членаў сказа. Адкажыце, чым абумоўлены такі парадак слоў.

1. Засмуцілася, зажурылася даль шырокая, неаглядная. (Якуб Колас).
2. На лісце прыдарожных дрэваў, на збажыну і траву аселі першыя кроплі расы. Над палеткамі разліўся непаўторны водар канюшыны .(А.Чарнышевіч).
3. Прыемнасць — пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць — пагутарыщь з разумным, шчасце — жыць, працаваць з чалавекам сумленным. (М.Танк)
4. Душы маей крануцца не пасмее ні старасці засохлая рука, ні смерці медзяністая завея, ні забыцца бяздумнага рака...Душа мая заўсёды будзе жыць у словах, поўных цеплыні і ласкі. (К.Буйло)

5. Нас разлучылі вёрсты. (С.Грахоўскі)
6. Вясна звінела ў парках ручайкамі, шчапала лёд, і плавіла снягі, і калыхала цёплымі вятрамі ўзнятыя над горадам сцягі. (М.Калачынскі).

**Заданне 3.** Выпішыце сказы, у якіх інверсія — сродак выражэння стылістычнай афарбоўкі, назавіце сказы, у якіх адваротны парадак слоў — парушэнне сінтаксічнай нормы (памылка).

1. Валодзю хочацца, каб мама яго, як і малодшую сястру, пахваліла.
2. У 1943 годзе была створана самая хвалюючая ў беларускай пластыцы скульптура "Мікалай Гастэла" А.А. Бембелем.
3. Калі вячэралі разам — маці, бацька і Масей, — пачалася, як і водзіцца паміж людзьмі, што доўга не бачыліся, гаворка.
4. Сонца ў моры купаецца бурным, скрозь вясёлы на палубе шум.
5. У друку з'яўляюцца сказы накшталт такога: "Аркадзь прыходзіць Куляшоў".

6. Пасля смерці бацькі Зіна з сьнам вярнуласяя ў родную вёску.
7. Магу ўвесь дом прызваць у сведкі, і кожны хочаш перад кім пацвердзіць зможа, што суседка мая звычайная зусім.
8. Шчодры сёлета ўраджай.
9. Цямнее край зубчаты бору... і тчэ, забыўшыся, рука, заміж персідскага ўзору, цвяток радзімы васілька.
10. Крыху адышоўшы ўбок, падрыўнік затуліўся за елку калматую, гатовы біцца да апошняга патрона

**Форма кантролю:** вуснае апытанне, праверка практычных заданняў

### *§ 2.5 Чужая мова і спосабы яе перадачы: простая, ускосная і няўласна-простая мова*

**Літаратура**

1. Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя /Пад агульн. рэд. Я.М.Адамовіча.— Мн., I989.
2. Сямешка Л.І., Шкраба І.Р., Бадзевіч Э.І. Курс беларускай мовы: Падручнік. — Мн.: Універсітэцкае, 1996. — С.623-631
3. Яўневіч М.С, Сцяцко П.У. Сінтаксіс сучасная беларускай мовы. — Выш. шк. 1987. — С. 232-237.

**Падрыхтуйце канспект, кіруючыся наступным планам:**

- Способы перадачы чужой мовы.
- Простая мова. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.
- Няўласна-простая мова і яе афармленне.
- Адрозненне простай мовы ад ускоснай. Правілы замены простай мовы ўскоснай.
- Афармленне дыялогу на пісьме.
- Цытата. Правілы афармлення цытат.

**Заданне.** Складзіце картатэку сказаў-прыкладаў па тэме "Чужая мова і спосабы яе перадачы"

**Форма кантролю:** праверка канспекта

## *§ 2.6 Пунктуацыя, яе прадмет і задачы. З гісторыі беларускай пунктуацыі*

**Літаратура:**

1.Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя /Пад агульн. рэд. Я.М.Адамовіча.— Мн., 1989.

2.Сямешка Л.І., Шкраба І.Р., Бадзевіч З.І. Курс беларускай мовы: Падручнік — Мн.: Універсітэцкае, 1996. — С.637-641.

3.Яўневіч М.С., Сцяцко П.У. Сінтаксіс сучасная беларускай мовы. — Мн. Выш. шк., 1987. — С 243-247.

**Падрыхтуйце канспект, кіруючыся наступным планам:**

- Прадмет і задачы пунктуацыі.
- Раздзяляльныя знакі прыпынку.
- Выдзяляльныя знакі прыпынку.
- Асноўныя правілы пастаноўкі кропкі, клічніка, пытальніка, шматкроп'я, коскі, кропкі з коскай, двукроп'я, працяжніка, дужак, двукосся.
- Спалучэнне знакаў прыпынку або іх паглынанне.
- З гісторыі беларускай пунктуацыі
-

**Форма кантролю:** праверка канспекта

# Заключэнне

Самастойная праца студэнтаў з’яўляецца адным з важнейшых элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта звязана з тым, што выкладчык толькі арганізуе і накіроўвае пазнаваўчую дзейнасць навучэнцаў. Яе эфектыўнасць залежыць ад уласных намаганняў студэнтаў. Таму самастойнае набыццё ведаў – адметная рыса навучання ў ВНУ. Па сутнасці, увесь працэс навучання ў вышэйшай школе – спецыяльна арганізаваная самастойная праца студэнтаў. Пры правільнай арганізацыі самападрыхтоўка мае вырашальнае значэнне для развіцця самастойнасці як адной з вядучых якасцяў спецыяліста з універсітэцкай адукацыяй і выступае сродкам, які забяспечвае студэнтам: 1) свядомае і добрае засваенне ведаў па прадмету; 2) авалоданне спосабамі і прыёмамі самаадукацыі; 3) развіццё патрэбнасці ў самастойным папаўненні ведаў.

Самападрыхтоўка спрыяе фарміраванню высокай культуры разумовай працы, набыццю прыёмаў і навыкаў самастойнай працы, уменняў рацыянальна выкарыстоўваць і размяркоўваць свой час, назапашваць і засвойваць неабходную для паспяховага навучання і прафесійнага станаўлення інфармацыю. Яна развівае ў студэнтаў арганізаванасць, дысцыплінаванасць, ініцыятыўнасць, волю; выпрацоўвае разумовыя ўменні і аперацыі (аналіз, сінтэз, параўнанне, супастаўленне і інш.), дазваляе сфарміраваць свой уласны стыль працы, які найбольш поўна адпавядае асабістым схільнасцям і пазнаваўчым навыкам студэнта.

Выбар мадэлі кіруемай самастойнай работы студэнтаў залежыць ад характару мэтавых груп навучэнцаў, тэрмінаў і задач навучання, суадносін тэорыі і практыкі ў змесце навучання. Пры гэтым назіраецца тэндэнцыя ўключэння кіруемай самастойнай работы студэнтаў у кантэкст модульнай, крэдытнай, рэйтынгавай адукацыйнай тэхналогіі, а таксама зварот да камбінаваных відаў навучання. Камбінаванне ажыццяўляецца як на ўзроўні інтэграцыі і ўзаемапранікнення тэхналогій, так і на ўзроўні спалучэння формаў навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Спіс літаратуры

1. Белкин Е. Л. и др. Педагогические основы самостоятельной работы студентов в вузе. – Орел, 1989.

2. Богоявленская А. Е. Педагогическое руководство самостоятельной работой и развитием познавательной самостоятельности студентов: Учеб. пособие. – Тверь: Твер. гос. ун-т, 2002.

3. Гузеев В. В. Теория и практика интегральных образовательных технологий. – М.: Знание, 2001.

4. Жук О. Л. и др. Педагогические основы самостоятельной работы студентов: Пособие для преподавателей и студентов / Под общ. ред. О. Л. Жук. - Мн.: РИВШ, 2005.

5. Лобанов А. П. Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А. П. Лобанов, Н. В. Дроздова. – Мн.: РИВШ, 2005.

6. Львов М. Р., Горецкий В. Г., Сосновская О. В. Методика преподавания русского языка в начальных классах: учебное пособие для студентов высших педагогических учебных заведений. – М., 2002.

7. Научно-методические основы и практика организации учебного процесса в вузе: Учеб. пособие / И. А. Новаков, Ю. В. Попов, В. Н. Подлеснов, В. Г. Кучеров, Е. Р. Андросюк, В. И. Садоаников / ВолгГТУ. – Волгоград, 2003.

8. Пидкасистый П. И. Самостоятельная познавательная деятельность школьников в обучении: Теоретико-экспериментальное исследование. – М.: Педагогика, 1980.

9. Пионова Р. С. Педагогика высшей школы. – Мн.: Універсітэцкае, 2002.

10. Яленскі М. Г. Асобасны падыход у методыцы навучання беларускай мове: Тэарэтыка-эксперыментальнае даследаванне / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны інстытут адукацыі. Навуковы рэдактар Протчанка В. У. — Мінск, 1997.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Анатацыя

Праца складаецца з уводзін, дзвюх глаў, заключэння, спіса выкарыстанай літаратуры (10 крыніц). У першай главе самастойная работа студэнтаў апісваецца як псіхолага-педагагічная праблема, характарызуюцца яе віды і ўзроўні, акрэсліваюцца патрабаванні да арганізацыі самастойнай працы студэнтаў. У другой главе прадстаўлены распрацоўкі форм кантролю па курсе “Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ